Любыя мае, родныя мае, ня сумуйце — аднаго прашу я. Які б нам лёс ня выпаў, будзем яго перажываць, абы б здароўе і сілы хапіла. Аб гэтым трэба дбаць.

Лорачка няхай не пераўтамляецца за чытаньнем. Гэта шкодна, а яна слабенькая. Анечка, раскажы ім, чаму тата не прыехаў гэтым выходным днём.

Падам яшчэ заяву на наступны выхадны дзень.

Анечка, Лорачка і Лялячка, моцна цалую Вас.

Ваш *Адзік і тата.*

## № 96. Элеаноры Бабарэцы

*6.III.1935 г.*

Дарагая Лорачка!

Ці напісала ты ліст да Галі і ці паслалі Вы картку? Калі яшчэ не паслалі, пашлеце — яны вельмі чакаюць яе.

Лорачка, як табе спадабаліся кніжкі, што я паслаў Вам? Ці цікавы „Гулівэр у ліліпутаў“? Ці ўсё ў ім зразумела? Напішы таксама і пра іншыя кніжкі. Што ў іх табе падабаецца, як ты іх разумееш, ці добра яны напісаны, мо' ёсьць у іх што такое, што ня трэба было–б пісаць, што вельмі–ж ужо непраўдзіва. Пра ўсё гэта напішы, Лорачка. *[Канец старонкі абрэзаны]*

…праверкаю хатніх работ сваіх вучняў, што выбралі цябе рабіць гэтую работу. Ці ня цяжка гэта для цябе?

Лорачка, прыяжджай разам з мамаю і Ляляю да мяне, як будуць у Вас вакацыі. Мы тут сходзім з Вамі ў кіно, а можа, і ў тэатр удасца схадзіць. Зойдзем у кнігарню, паглядзім, ці няма цікавых кніжак. Паходзім па магазінах, мо' што знойдзем Вам купіць.

Паглядзіце, як я тут жыву і сумую па Вас.

Моцна цалую цябе, Лорачка.

Твой *тата.*

Перадай прывітаньне Міхееўне.

## № 97. Алесі Бабарэцы

*6 сакавіка 1935 г.*

Дарагая Лялячка!

Мама пісала, што ты Гулівэра ў сад насіла і дзецям чытала. Якая–ж ты малайчына!

Ці–ж спадабаўся дзецям Гулівэр і ліліпуты?

У Вас цяпер у садзе, пэўна, цікавей стала. Бачыш, вы робіце ўсякія рамкі і іншыя ўкрасы. А ці развучваеце Вы якія песьні і ці дэклямуеце вы якія вершы, — гэтага ты, Лялячка, і не напісала ў сваёй лістоўцы. А мне гэта цікава, ты напішы.

Напішы, як табе спадабаліся кніжкі, што я прыслаў? Што ты цяпер чытаеш і ці добра ўжо чытаеш, ці ўсё разумееш, як чытаеш?

Прыяжджай, Лялячка, ка мне з мамаю і Лораю, як будуць у іх вакацыі. Я буду вельмі рад.